# Сінтаксіс і пунктуацыя

# СКАЗЫ З АДАСОБЛЕНЫМІ ЧЛЕНАМІ

**Члены сказа, выдзеленыя па сэнсе і інтанацыйна, называюцца адасобленымі. На пісьме яны выдзяляюцца коскамі, радзей – працяжнікамі.**

## Адасабляюцца і выдзяляюцца коскамі на пісьме:

**любыя адасабленні,** **калі яны адносяцца да асабовага займенніка:**

***У кароткім кажушку, са стрэльбай за плячыма, ён абыходзіць калгасны табун.***

***(З. Бядуля)***

**азначэнні,** **выражаныя дзеепрыметнікавымі ці прыметнікавымі зваротамі, і** **аднародныя азначэнні** **(дапасаваныя і недапасаваныя), калі яны стаяць пасля назоўніка, які паясняюць:**

***Яшчэ не апаў шчэбень, выкінуты першым выбухам, як на насыпе грымнула зноў.***

***(І. Мележ)***

***Змораны чорны конь, увесь мокры ад поту, ішоў ледзь перастаўляючы ногі.***

***(І. Пташнікаў)***

**Заўвага.** Могуць адасабляцца азначэнні, калі:

СТАЯЦЬ ПЕРАД НАЗОЎНІКАМ І МАЮЦЬ ДАДАТКОВАЕ АКАЛІЧНАСНАЕ ЗНАЧЭННЕ ПРЫЧЫНЫ, УМОВЫ ЦІ ЎСТУПКІ:

*Зусім непісьменная, маці мела практычны розум і нядрэнна спраўлялася з гаспадаркай. (Ю. Гаўрук)*

ПАМІЖ АЗНАЧЭННЕМ, ЯКОЕ ПАЯСНЯЕ ДЗЕЙНІК, І ГЭТЫМ ДЗЕЙНІКАМ СТАІЦЬ ВЫКАЗНІК:

*Стомлены дарогай, прысеў Іван на прыступкі ганка. (М. Гарэцкі)*

*Высушаныя гарачым сонцам, паніклі кветкі і травы. (Б. Мікуліч)*

# Адасобленыя прыдаткі

**Адасабляюцца коскамі**

- **АДЗІНОЧНЫЯ І РАЗВІТЫЯ ПРЫДАТКІ, ЯКІЯ СТАЯЦЬ ПАСЛЯ АЗНАЧАЕМАГА СЛОВА – УЛАСНАГА НАЗОЎНІКА:**
- *Збоку ля Зосі, абапёршыся на плечыка, стаяла Шура, **камсамолка**.*
- *(К. Крапіва)*
- *Шчара, **прыгожая і чароўная рэчка**, упадае ў Нёман. (Я. Пархута)*

**Адасабляюцца коскамі**

- **РАЗВІТЫЯ ПРЫДАТКІ, ЯКІЯ СТАЯЦЬ ПЕРАД АЗНАЧАЕМЫМ СЛОВАМ – АГУЛЬНЫМ НАЗОЎНІКАМ – І ПАСЛЯ ЯГО:**
- *Пры ім заўсёды быў **сябар душы**, гармонік. (А. Кулакоўскі)*
- *На сяле праспявалі апошнія пеўні, **вешчуны блізкай зары і новага дня**. (В. Каваль)*

**Адасабляюцца коскамі**

- **РАЗВІТЫЯ І АДЗІНОЧНЫЯ ПРЫДАТКІ, ЯКІЯ АДНОСЯЦЦА ДА АСАБОВАГА ЗАЙМЕННІКА, НЕЗАЛЕЖНА АД ТАГО, ДЗЕ ЯНЫ РАЗМЕШЧАНЫ – ПЕРАД ЗАЙМЕННІКАМ ЦІ ПАСЛЯ ЯГО:**
- ***Былы дырэктар школы**, ён, магчыма, лепш, чым хто другі, ведаў, якая гэта складаная рэч – выхаванне дзяцей. (І. Шамякін)*

**Заўвагі.** **Прыдаткі, якія стаяць перад азначаемым словам – уласным назоўнікам, адасабляюцца, калі яны маюць прычыннае ці ўступальнае значэнне:**

*Вялікі знаўца чалавечай душы, Якуб Колас разумеў малодшага брата-пісьменніка. (М. Лужанін)*

**Адзіночныя прыдаткі, якія стаяць пасля ўласнага імя, могуць у асобых выпадках зліваацца з ім па сэнсе (у маўленні), таму на пісьме не адасабляюцца:**

*Зала заціхла, калі на сцэну выйшаў Пеця-баяніст.*

*(А. Кулакоўскі)*

**Адзіночныя прыдаткі адасабляюцца ў тых выпадках, калі яны стаяць пасля азначаемага слова – агульнага назоўніка, які мае пры сабе азначэнне:**

*У клуб прыехалі нашы даўнія шэфы, трактаразаводцы. (Газета)*

**Прыдаткі са словамі *па імені, па мянушцы* адасабляюцца разам з гэтымі словамі:**
***У суседа была карова, па мянушцы Ланя. (Б. Сачанка)***

**Прыдаткі са злучнікам як адасабляюцца ў тым выпадку, калі маюць адценне прычыны:**
***Валя, як самая лепшая вучаніца класа, рэкамендавана да ўдзелу ў алімпіядзе***

**Калі злучнік *як* ужываецца са значэннем *"у якасці", "у ролі"*, то назоўнік са злучнікам як не з'яўляецца прыдаткам і на пісьме коскамі не выдзяляецца:**
***У вёсцы Васіля ведалі як цудоўнага выдумшчыка. (М. Машара)***

**Прыдаткі са злучнікам ці, або адкасабляюцца, калі маюць удакладняльнае значэнне:**
***Хроніка Быхаўца, або летапіс Быхаўца, найбольш поўны са спісаў старажытных беларуска-літоўскіх летапісаў. (А. Жураўскі)***

# Адасобленыя акалічнасці

Акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўямі
і дзеепрыслоўнымі зваротамі, адасабляюцца і на пісьме
выдзяляюцца коскамі:
***Забыўшыся пра ўсё на свеце,*** *я ўважліва разглядаў
жураўлёў з надзейнага сховішча. (В. Вольскі)*

Заўсёды адасабляюцца акалічнасці з
прыназоўнікам
***нягледзячы на***, якія маюць значэнне ўступкі:
***Нягледзячы на сваё недамаганне,*** *маці сабралася
у дарогу да дачкі. (Б. Сачанка)*

**Заўвагі.** Не адасабляюцца і не выдзяляюцца коскамі
фразеалагізмы тапу ***склаўшы рукі, нясолана
хлябаўшы,
на нач гледзячы, на лес гледзячы, заплюшчыўшы
вочы,
свету не бачачы*** і інш.
*Хлопец мужнее і расце* ***на лес гледзячы.*** *(М. Зарэцкі)*

)

Не выдзяляюцца коскамі два сумежныя
адасобленыя
дзеепрыслоўі (дзеепрыслоўныя словазлучэнні),
звязаныя злучнікамі ***і, ды, ці***:
*Махнач стаяў каля сціпты саломы, як заўсёды,*
***утаропіўшы*** *вочы ў зямлю і* ***сашчапіўшы*** *рукі на
жываце.
(І. Шамякін)*

Ад адасобленых дзеепрыслоўяў трэба адрозніваць словы
тыпу ***стоячы, лежачы, седзячы, спяшаючыся, гуляючы*** і інш.,
якія маюць прыслоўнае значэнне. Звычайна яны стаяць
пасля выказніка, часцей у канцы сказа і коскамі
**не выдзяляюцца**:
*Хлопчык спаў седзячы.*

# Адасабленне ўдакладняльных акалічнасцей

Адасабляюцца, выдзяляюцца інтанацыяй у маўленні і коскамі на пісьме часцей за ўсё ўдакладняльныя акалічнасці месца і часу.

Яны адказваюць на тое ж пытанне, што і адасобленыя, але маюць больш шырокае значэнне.

Адасобленыя акалічнасці канкрэтызуюць, дэталізуюць месца, час, спосаб дзеяння, а удакладняльныя з'яўляюцца больш агульнымі ў адносінах да месца, часу і спосабу дзеяння.

*__Тут__, у Альбуці, кволая паэтычная іскра загарэлася той векапомнай вясной. (С.Александровіч)*

*__На Нёмане__, у вёсцы Пясочнае, прайшло маленства і юнацтва Адама Русака. (П. Прыходзька)*

*__У жніўні__, незадоўга да вяселля, яны ездзілі да бацькоў Аленкі, у Мінск. (У. Караткевіч)*

# Адасабленне ўдакладняльных дапаўненняў і іншых членаў сказа

**Адасобленыя ўдакладняльныя дапаўненні звычайна выражаюцца спалучэннямі назоўнікаў або займеннікаў у формах ускосных склонаў з прыназоўнікамі *акрамя, апрача, замест, за выключэннем*.**

**У структуры сказа адасобленыя дапаўненні маюць абмежаванае значэнне або паказваюць на ўключэнне прадмета ў лік іншых, на выключэнне яго з ліку аднародных, на замяшчэнне аднаго прадмета другім:**

***Лена апраўдвае сваіх выхаванцаў, нават хлопцаў усіх, за выключэннем Толіка Шарэйкі. (Я Брыль)***

**Адасабляюцца і ўдакладняюцца спалучэнні са словамі *асабліва, нават, пераважна, напрыклад, у тым ліку* і інш., якія маюць дадатковае адценне ўзмацняльнасці (выдзяляльнасці):**

***На ўскрайку горада стаялі невялікія домікі, пераважна драўляныя. (М. Лынькоў)***

**Заўвага.** **Словы *асабліва, нават, пераважна* могуць і не мець ўдакладняльнага значэння. Тады перад імі коска не ставіцца:**

***Работа не спынялася нават у дождж. (І. Навуменка)***

# Адасабленне ўдакладняльных дапаўненняў і іншых членаў сказа

**Адасабляюцца і іншыя члены сказа, якія маюць удакладняльнае значэнне:**

***Каля лесу танцавалі яны – жураўлі. (В. Вольскі)***

***(Удакладняльны дзейнік)***

***Па левы бок шашы ўзведзены Курган Славы – помнік нашай гісторыі. (С. Грахоўскі)***

***(Удакладняльны прыдатак)***

***Ахоўнікі рэгулярна праходжваліся каля багажа, сачылі за яго захаванасцю. (Б. Сачанка)***

***(Удакладняльны выказнік)***

***Хлопец купіў сіне-белую, у палоску, кашулю-безрукаўку… (С. Баранавых)***

***(Удакладняльнае азначэнне)***

# Сінтаксічны разбор сказа з адасобленымі членамі

## Пісьмовы.

***Неба**, **зацягнутае шэрымі хмарамі**, **нізка** **павісла** **над лесам**. (У. Карпаў)*

## Вусны.

**Сказ просты, апавядальны, няклічны, двухсастаўны, развіты, ускладнены адасобленым азначэннем, поўны.**

**(Што?)** ***неба*** **– дзейнік, выражаны назоўнікам у форме Н. скл., адз. л.;**

***неба*** **(што зрабіла?)** ***навісла*** **– просты выказнік, выражаны дзеясловам абв. ладу, пр.ч., адз. л., 3-й ас.;**

***неба*** **(якое?)** ***зацягнутае шэрымі хвалямі*** **– адасобленае азначэнне, выражана дзеепрыметнікавым зваротам;**

***навісла*** **(як?)** ***нізка*** **– акалічнасць спосабу дзеяння, выражана прыслоўем.**

**Адасобленае азначэнне стаіць у сярэдзіне сказа, з двух бакоў выдзяляецца коскамі.**